# § 37. Эпоха Асветніцтва

ДЖОН ЛОК
АСВЕТНЫ АБСАЛЮТЫЗМ
АСВЕТНІЦТВА ДЭНІ ДЗІДРО
КАНСТЫТУЦЫЙНАЯ МАНАРХІЯ
ЖАН-ЖАК РУСО ВАЛЬТЭР
КЛАСІЦЫЗМ
ШАРЛЬ-ЛУІ МАНТЭСК'Ё

Эпоха Асветніцтва

**1. Сутнасць і асноўныя ідэі Асветніцтва.** Эпоха **Асветніцтва** як гістарычны перыяд адзначылася вялікімі зменамі ў мысленні і культуры еўрапейскага грамадства. Гэта быў час, калі філосафы, вучоныя і пісьменнікі пачалі сумнявацца ў традыцыйных уяўленнях пра грамадства, рэлігію, навуку і мастацтва. Уплыў ідэй Асветніцтва не толькі на Заходнюю, але і на Усходнюю Еўропу быў велізарны. Менавіта тады людзі пачалі ставіць пытанні аб прыродзе чалавека, яго правах і абавязках, грамадскай арганізацыі. Найбольш вядомымі прадстаўнікамі эпохі Асветніцтва былі французскія філосафы Вальтэр, Жан-Жак Русо, Дэні Дзідро і інш. Яны выставілі і сфармулявалі асноўныя ідэі і палажэнні гэтага агульнаеўрапейскага руху.

**Асветніцтва** — культурна-філасофскі рух у Еўропе ў XVIII ст., звязаны з пашырэннем навуковых ведаў і ідэі свабоды чалавека.

Розум, свабода, роўнасць — асноўныя ідэі Асветніцтва

*Розум*, рацыяналізм, вера ва ўсёмагутнасць чалавечай думкі — ключавая ідэя Асветніцтва. Людзі імкнуліся да разумення свету і грамадскіх з'яў на аснове рацыянальных прынцыпаў і навуковага метаду. Гэта прывяло да з'яўленння новых навук, такіх як фізіка, хімія, біялогія, эканоміка і сацыялогія.

*Свабода* — людзі павінны быць вольнымі ад самавольства дзяржавы і царквы, а таксама мець свабоду выбіраць веру, лад жыцця і прафесію. Такая ідэя была



„Асветніцтва — гэта выхад чалавека са стану свайго непаўналецця, у якім ён знаходзіцца з уласнай віны. Непаўналецце ёсць нздольнасць карыстацца сваім розумам без кіраўнцтва з боку кагосьці іншага. Непаўналецце з уласнай віны — гэта такое, прычына якога ляжыць не ў недахопе розуму, а ў недахопе рашучасці і мужнасці карыстацца ім без кіраўніцтва з боку кагосьці іншага“.

Імануіл Кант,
нямецкі філосаф, адзін з мысляроў эпохі Асветніцтва

Што такое, на думку аўтара, «непаўналецце» чалавека?

пакладзена ў аснову барацьбы за правы чалавека і грамадзяніна.

*Роўнасць* — людзі павінны быць роўнымі перад законам і мець роўныя магчымасці для адукацыі, прафесійнага росту і грамадскай дзейнасці, незалежна ад сацыяльнага паходжання. Гэтая ідэя была асновай барацьбы за ліквідацыю прыгонніцтва, рабства і іншых формаў сацыяльнай дыскрымінацыі.

## АСНОЎНЫЯ ІДЭІ АСВЕТНІЦТВА

**СВАБОДА**
- свабода ад самавольства дзяржавы і царквы;
- свабода выбару

**РОЎНАСЦЬ**
- роўнасць перад законам;
- роўныя магчымасці

**РОЗУМ**
- рацыяналізм;
- вера ва ўсёмагутнасць чалавечага розуму

Ідэі Асветніцтва пашырыліся па ўсёй Еўропе і зрабіліся асновай для палітычных і сацыяльных рэформаў у многіх краінах. Яны паспрыялі развіццю адукацыі, культуры і навукі, а таксама стварэнню новых інстытутаў цывільнага грамадства.

«Энцыклапедыя» Д. Дзідро, шматтомнае выданне, якое змяшчала аб'ёмную для свайго часу інфармацыю з розных галін ведаў, зрабілася своеасаблівым помнікам эпохі Асветніцтва. Аўтар наступным чынам сфармуляваў мэту Асветніцтва: «Пашырэнне ведаў пра ўсё ў свеце, пра навуку, рамёствы і мастацтвы». Яшчэ адной з мэт Асветніцтва было вызваленне чалавека ад невуцтва і забабонаў, развіццё яго розуму і здольнасці да крытычнага мыслення.

### Літаратура эпохі Асветніцтва




*Тытульны аркуш «Энцыклапедыі». XVIII ст.*

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, чаму «Энцыклапедыю» Д. Дзідро можна назваць правадніком ідэалогіі Асветніцтва.

Еўрапейскія мысляры выкладалі свае ідэі ў розных відах літаратурных твораў. У эпоху Асветніцтва актыўна развівалася мастацкая літаратура. З чыста забаўляльнай яна ператваралася ў сродак для пашырэння новых ідэй і ведаў. Найбольш вядомымі літаратурнымі творамі Асветніцтва зрабіліся «Эміль, або Аб выхаванні» і «Грамадскі дагавор» *Жан-Жака Русо*, «Гулівер у краіне ліліпутаў» *Джонатана Свіфта*, эсэ «Вопыт чалавечага разумення» *Джона Лока* і інш.

У мастацтве новыя ідэі прывялі да з'яўлення новага стылю — *класіцызму* — і спрыялі далейшаму развіццю жанраў камедыі і сатыры. Эпоха Асветніцтва зрабілася адной з ідэйных крыніц Вялікай французскай рэвалюцыі. Яна адыграла велізарную ролю ў фарміраванні сучаснага свету.

### Асветніцтва ў Англіі і Францыі

**2. Асаблівасці Асветніцтва ў асобных еўрапейскіх краінах.** Ідэі Асветніцтва ў кожнай з еўрапейскіх краін мелі свае асаблівасці. У Англіі Асветніцтва было звязана з навукай і тэхнічным прагрэсам, абмежаванай крытыкай рэлігіі і царквы. Тут з'явілася шмат вынаходстваў і адкрыццяў, якія спрыялі эканамічнаму росту і прамысловаму развіццю. У гэтай краіне новыя ідэі не насілі настолькі рэвалюцыйнага характару, як у Францыі.


LE
IOVRNAL
DES
SÇAVANS
Du Lundy V. Ianvier M. DC. LXV.
Par le Sieur DE HEDOVVILLE.
A PARIS,
Chez IEAN CVSSON, ruë S. Iacques, à l'Image de S. Iean Baptiste.
M. DC. LXV.
AVEC PRIVILEGE DV ROY.

*Тытульны аркуш першага нумара навукова-папулярнага часопіса «Журналь дэ сава́н». Францыя. 1665 г.*

Найбольш вядомымі асветнікамі ў Англіі былі *Джон Лок*, ***Ісак Ньютан*** і *Джордж Берклі*. Джон Лок лічыў, што крыніцаю ведаў з’яўляецца досвед, а не прыроджаныя ідэі. Ён выступаў за абмежаванне ўлады і абарону правоў асобы. Яго працы былі шырока вядомыя, аказалі ўплыў на філосафаў і палітыкаў у іншых краінах.

У Францыі Асветніцтва было больш звязана з палітычнымі зменамі і барацьбой за правы чалавека. Французскія асветнікі заклікалі да свабоды і роўнасці, умацавання цывільнага грамадства і абмежавання ўлады караля, царквы і арыстакратыі. Некаторыя з іх адкрыта заяўлялі пра неабходнасць звяржэння існуючага ладу, што і адбылося ў перыяд Вялікай французскай рэвалюцыі.

Адным з найбольш вядомых французскіх асветнікаў быў Вальтэр. Ён выступаў супраць тыраніі і няроўнасці, адстойваў свабоду сумлення і слова. Вальтэр быў аўтарам многіх філасофскіх і мастацкіх сачыненняў. Яго працы і думкі аказалі значны ўплыў на Вялікую французскую рэвалюцыю і сфарміравалі пазіцыю і погляды многіх палітычных дзеячаў таго часу.

Як распаўсюджваліся ідэі Асветніцтва?

Агульнымі рысамі Асветніцтва ў Англіі і Францыі з’яўляліся павага да розуму, навукі, рацыянальнага мыслення, імкненне да асветы і барацьба за правы і свабоду чалавека.

## Асветніцтва ў Германіі

Эпоха Асветніцтва ў Германіі надышла значна пазней, чым у Англіі або Францыі. Асветніцтва ў Германіі было стрыманым, не такім матэрыялістычным і атэістычным, як у іншых краінах. Нямецкія асветнікі больш распрацоўвалі філасофскія і тэарэтычныя пытанні. Паколькі Германія была раздробленай краінай, культурныя цэнтры ўзнікалі ў княжацкіх рэзідэнцыях, універсітэтах, вольных імперскіх гарадах — цэнтрах духоўнай культуры, такіх як Лейпцыг, Гётынген, Веймар і інш.

Адной з галоўных постацей Асветніцтва ў Германіі быў *Імануіл Кант*, выбітны філасоф, чые ідэі сфарміравалі новы кірунак у філасофіі. Найбольш вядомай яго работай з'яўляецца «Крытыка чыстага розуму».

## ПРАЦУЕМ З ГІСТАРЫЧНАЙ КРЫНІЦАЙ

### Фрагменты з «Духу законаў», кніга XI, Ш.-Л. Мантэск'ё

У кожнай дзяржаве ёсць тры роды ўлады: улада заканадаўчая, улада выканаўчая, што кіруе пытаннямі міжнароднага права, і ўлада, што кіруе пытаннямі права грамадзянскага…

Калі ўлада заканадаўчая і выканаўчая будуць злучаны ў адной асобе або ўстанове, то свабоды не будзе, бо можна апасацца, што гэты манарх або сенат пачне ствараць тыранічныя законы для таго, каб гэтаксама тыранічна прымяняць іх.

Не будзе свабоды і ў тым выпадку, калі судовая ўлада не аддзелена ад улады заканадаўчай і выканаўчай. Калі яна злучана з заканадаўчай уладай, жыццё і свабода грамадзян трапяць пад уладу самавольства, бо суддзя будзе заканадаўцам. Калі судовая ўлада злучана з выканаўчай, тады суддзя атрымлівае магчымасць быць прыгнятальнікам.

1. *Якія віды ўлады маюць існаваць у дзяржаве, на думку Шарля-Луі Мантэск'ё?*
2. *Чаму кожная ўлада павінна выконваць свае ўласныя функцыі?*
3. *Якія з ідэй асветнікаў актуальныя сёння? Як ідэя падзелу ўладаў рэалізавана ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь?*

### Урывак з «Вучэння аб грамадстве», І. Кант

Найвялікшая праблема для чалавечага роду, вырашыць якую яго вымушае прырода, — дасягненне ўсеагульнага прававога грамадства. Толькі ў грамадстве, і менавіта ў такім, у якім членам яго даецца найвялікшая свабода… можа быць дасягнута найвышэйшая мэта прыроды: развіццё ўсіх яе задаткаў, закладзеных у чалавецтве; пры гэтым прырода жадае, каб гэтую мэту, як і ўсе іншыя наканаваныя яму мэты, яно [чалавецтва] само ажыццявіла…

1. *Што, на думку аўтара, з'яўляецца «найвышэйшай мэтай прыроды»?*
2. *У якім грамадстве можа быць дасягнута гэтая мэта? Якія характарыстыкі, на вашу думку, павінна мець такое грамадства?*

Іншай важнай постаццю Асветніцтва ў Германіі быў *Іаган Готфрыд Гердэр* — філосаф, пісьменнік і лінгвіст, які зрабіў значны ўнёсак у развіццё літаратуразнаўства, эстэтыкі і тэорыі мовы. Ён распрацаваў тэорыю аб тым, што кожная культура мае сваю ўнікальную мову і нацыянальны дух.

Ва ўмовах эканамічнай і палітычнай раздробленасці Германіі важную ролю адыгрывала мастацкая літаратура. Менавіта яна выступала за аб'яднанне краіны, узнімала надзённыя сацыяльныя праблемы. Перыяд найбольшага ўздыму нямецкага Асветніцтва ўвайшоў у гісторыю як «эпоха Лесінга» — такі значны быў унёсак гэтага паэта і драматурга ў нямецкую культуру. З імем *Готхальда Эфраіма Лесінга* звязаныя развіццё асветніцкага рэалізму і крытыка класіцызму з пазіцый патрабаванняў новага часу. Характары герояў маюць быць «рэальнымі», «звычайнымі», «будзённымі» — такі адзін з найважнейшых літаратурных прынцыпаў Лесінга. У пазнейшы перыяд стваралі два вялікія класікі нямецкай літаратуры — *Іаган Вольфганг Гётэ* і *Фрыдрых Шылер*.

Эпоха Асветніцтва ў Германіі прадстаўлена таксама імёнамі выбітных музыкантаў і кампазітараў — *Іаган Себасцьян Бах*, *Людвіг ван Бетховен* і інш.

**Асветніцтва ў еўрапейскіх краінах**

| **Англія** | **Францыя** | **Германія** |
|---|---|---|
| Замацаванне здабыткаў рэвалюцыі. Імкненне перавыхаваць чалавека паводле буржуазных вартасцей | Адмаўленне феадальнага ладу і заклік да барацьбы супраць яго. Сцвярджэнне ідэй свабоды, роўнасці і братэрства | Заклік да абуджэння нацыянальнай самасвядомасці і аб'яднання зямель |

Што аб'ядноўвала мысляроў Асветніцтва?

Дзякуючы творчасці вялікіх дзеячаў навукі, літаратуры і мастацтва Германія ў XVIII ст. ператварылася ў адзін з цэнтраў інтэлектуальнага прагрэсу ў Еўропе.

**3. Асаблівасці палітыкі асветнага абсалютызму.** Галоўная ідэя **асветнага абсалютызму** заключалася ў тым, што манарх павінен кіраваць, абапіраючыся на прынцыпы розуму і навукі, выкарыстоўваць сваю ўладу ў інтарэсах усяго грамадства, без выключэння асобных саслоўяў або класаў. Падданыя, у сваю чаргу, маюць праяўляць лаяльнасць у дачыненні да манарха, усяляк падтрымліваць яго пачынанні, каб дасягнуць «агульнага дабра». Палітыка асветнага абсалютызму была накіравана на скасаванне рэштказ сярэдневяковага феадальнага ладу. Але галоўнай яе мэтай з'яўлялася захаванне цэнтралізаванай манархічнай улады.

**Асветны абсалютызм** — палітыка, што праводзілася ў другой палове XVIII ст. шэрагам еўрапейскіх манархаў, якія знаходзіліся пад уплывам ідэй Асветніцтва.

Пад уплывам ідэй Асветніцтва манархі праводзілі рэформы ў галіне правасуддзя, адукацыі, эканомікі, адміністрацыйнага кіравання і вайсковай справы; займаліся рэгуляваннем цэн на прадукты.

Адным з кірункаў палітыкі асветнага абсалютызму было аслабленне ўлады царквы. Каралі разумелі, што царква магла выступіць як перашкода на шляху мадэрнізацыі, укаранення новых ідэй, таму ажыццяўлялі секулярызацыю царкоўных зямель і маёмасці.

### Плюсы і мінусы палітыкі асветнага абсалютызму

Аднак асветны абсалютызм не быў прагрэсіўнай ідэалогіяй у сучасным разуменні гэтага тэрміна. Манархі захоўвалі сваю ўладу і кантроль над грамадствам і не ставілі перад сабой задачу стварэння сапраўды дэмакратычнага ладу. Яны выкарыстоўвалі ідэі Асветніцтва ў сваіх інтарэсах, для ўмацавання і захавання сваёй улады. Тым не менш асветны абсалютызм зрабіўся важным этапам у развіцці еўрапейскай палітычнай думкі і ўдасканаленні дзяржаўнага ладу.



*Партрэт Леанарда Эйлера. Мастак Я. Э. Хандман. 1756 г.*

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы інфармацыі, даведайцеся, як вядомы матэматык і механік Л. Эйлер звязаны з Санкт-Пецярбургам.

М. В. Ламаносаў быў перакананы, што «дзе мала пісьменных, дужа мала карысці будзе». Даведайцеся, якія праекты арганізацыі сярэдняй і вышэйшай адукацыі ў Расіі прапанаваў М. В. Ламаносаў.

**4. Эпоха Асветніцтва ў Расіі.** Выключнай своеасаблівасцю вылучалася расійскае Асветніцтва. Упершыню асветніцкія ідэі былі рэалізаваны пры Пятры I у арганізацыі свецкіх школ на заходні ўзор. Першымі падобнымі навучальнымі ўстановамі зрабіліся навігацкая і медыцынская школы ў Маскве, марская акадэмія, інжынерная і артылерыйская школы ў Пецярбургу. На загад Пятра I былі выдадзены свецкія падручнікі і настаўленне для маладых дваран «Юнацтва праўдзівае люстра», перакладзенае з нямецкай мовы. З запрошаных замежных вучоных ён сфарміраваў Акадэмію навук, пры якой пазней адкрыліся Акадэмічная гімназія і першая ў Расіі свецкая вышэйшая навучальная ўстанова — Акадэмічны ўніверсітэт. У праўленне дачкі Пятра I імператрыцы Лізаветы быў адкрыты Маскоўскі ўніверсітэт, які стаў першым расійскім класічным універсітэтам. Ініцыятарамі яго стварэння былі дзяржаўны дзеяч, мецэнат І. І. Шувалаў і выдатны вучоны, выхадзец з паморскіх сялян М. В. Ламаносаў.

Галоўная асаблівасць Асветніцтва ў Расіі заключалася ў вядучай ролі дзяржавы ў пераўтварэнні грамадства. Менавіта дзяржава займалася рэарганізацыяй сістэмы адукацыі і выступіла ініцыятарам абмеркавання шэрагу вострых праблем. Неабходна адзначыць яшчэ адну асаблівасць расійскага Асветніцтва: ва ўмовах поўнага панавання ў патрыярхальнай Расіі рэлігійнай свядомасці і каштоўнасцей асветніцкія ідэі пачалі ім супрацьпастаўляцца. Так, ідэал веры супярэчыў ідэі рацыянальнага пазнання, а ідэал святога — ідэалу дасведчанага, адукаванага чалавека.

### Кацярына II і асветны абсалютызм

У другой палове XVIII ст. ідэі еўрапейскіх асветнікаў былі добра вядомыя адукаванай частцы расійскага грамадства, але, відаць, найбольшай іх прыхільніцай была імператрыца Кацярына II. Яна вяла актыўную перапіску з шэрагам французскіх філо-

## ПРАВОДЗІМ МІНІ-ДАСЛЕДАВАННЕ

Паводле задумы Кацярыны II, каб правіць у духу асветнага абсалютызму, трэба было правесці пераўтварэнні па чатырох кірунках:

- спрыяць развіццю адукацыі;
- ствараць прававахоўную сістэму, якую будзе паважаць і падтрымліваць насельніцтва;
- распрацаваць сістэму зразумелых і абавязковых для ўсіх законаў;
- падтрымліваць аўтарытэт дзяржавы ў вачах суседзяў.

1. *Імператрыца заснавала адзін з найбуйнейшых музеяў свету — Эрмітаж — і Расійскую нацыянальную бібліятэку ў Санкт-Пецярбургу. Прывядзіце прыклады яе пераўтварэнняў у дзяржаве, якія адпавядалі дадзеным кірункам.*
2. *Ці можна сказаць, што палітыка Кацярыны II была накіравана на рэалізацыю ідэй Асветніцтва? Свой адказ аргументуйце.*

сафаў (Вальтэр, Д. Дзідро), сціпла называючы сябе іх вучаніцай.

У Расіі XVIII ст. ужо з'яўляліся грамадскія дзеячы, якія спрабавалі праводзіць у жыццё ідэі Асветніцтва, не атрымліваючы на тое санкцый ад вярхоўнай улады. З'яўляліся сярод расійскіх мысляроў і «бунтаўшчыкі», якія рашуча выступалі супраць не толькі асобных хібаў грамадства, але і ў цэлым грамадска-палітычных парадкаў Расіі. Сярод такіх дзеячаў больш за іншых непакоіў саму імператрыцу А. М. Радзішчаў. У сваёй кнізе «Падарожжа з Пецярбурга ў Маскву» мысляр настойваў на шкодзе не толькі прыгоннага права (чым і атрымаў шырокую вядомасць), але і самадзяржаўя, якія, на яго думку, безумоўна павінны былі быць знішчаны.

Такім чынам, выказаныя расійскімі мыслярамі і грамадскімі дзеячамі ідэі ў духу Асветніцтва былі шчыльна звязаны з найбольш актуальнымі для Расіі праблемамі.

Назавіце асаблівасці Асветніцтва ў Расіі.

**5. Культура Усходу ў эпоху еўрапейскага Асветніцтва.** У адрозненне ад Еўропы культура Усходу XVII–XVIII стст. па-ранейшаму насіла традыцыйны характар. Яна ўяўляла сабой унікальнае перапляценне традыцый, рэлігійных вераванняў і мастацкіх дасягненняў. Асаблівай увагі ў гэтым кантэксце заслугоўваюць гістарычна развітыя дзяржавы Усходу — Кітай, Індыя, краіны мусульманскага свету і іншыя, што зрабілі вялікі ўнёсак у скарбніцу сусветнай культуры.

**Цынскі перыяд у гісторыі Кітая**

Развіццё кітайскай культуры ў Новы час супала з захопам Кітая маньчжурамі і ўсталяваннем улады маньчжурскай дынастыі Цын (1644–1912 гг.). Цынскі перыяд у гісторыі Кітая неадназначна ацэньваецца гісторыкамі. Тым не менш маньчжурская заваёва істотна не адбілася на развіцці кітайскай культуры. Маньчжуры, асабліва прыдворныя колы, хутка пераймалі кітайскую мову, а імператары апекаваліся над развіццём мастацтва. Час праўлення дынастыі Цын часта называюць эпохаю кітайскага імпрэсіянізму ў жывапісе. Філасофія канфуцыянства па-ранейшаму аказвала ўплыў на адукацыю і палітычную думку, у той час як даасізм і будызм рабілі свой унёсак у духоўны змест літаратурных твораў. У Кітаі дзейнічалі многія слаўныя майстры ў галіне літаратуры. Асаблівае месца сярод іх займаюць Юань Мэй (паэт і пісьменнік, аўтар фантастычных апавяданняў) і Цаа Сюэцзінь (стваральнік рамана «Сон у чырвоным цераме»).

Выкарыстоўваючы дадатковыя крыніцы, даведайцеся, што вывучае «чырваназнаўства» («чырваналогія»).

**Мусульманскі свет**

Індыя і краіны мусульманскага свету ў гэты час таксама перажывалі культурны ўздым. У Індыі развіваліся жывапіс, архітэктура (напрыклад, Тадж-Махал) і літаратура на персідскай мове і хіндзі, заснаваныя на сінтэзе ісламскіх і мясцовых традыцый. У мусульманскім свеце, асабліва ў Персіі і Асманскай імперыі, квітнелі паэзія, філасофія і архітэктура.

*Ідэі Асветніцтва адкрылі новы этап грамадскага і духоўнага развіцця Еўропы. Асноўнымі цэнтрамі гэтага руху былі Англія, Францыя і Германія. У кожнай краіне эпоха Асветніцтва мела свае адметныя рысы. Гэтыя ідэі зрабіліся ідэалагічнымі перадумовамі палітычных рэвалюцый, што скаланалі заходні свет напрыканцы XVIII ст. Культура Усходу ў эпоху еўрапейскага Асветніцтва ўяўляла сабой унікальнае перапляценне традыцый, рэлігійных вераванняў і мастацкіх дасягненняў.*

| калі ў свеце… | на тэрыторыі Беларусі… |
|---|---|
| Другая палова XVIII ст. — палітыка асветнага абсалютызму ў асобных краінах Еўропы | 1788–1792 гг. — «Чатырохгадовы сойм», на якім прыняты шэраг важных рашэнняў у рэчышчы буржуазных пераўтварэнняў |

**ПЫТАННІ І ЗАДАННІ**

1. Ахарактарызуйце ідэі эпохі Асветніцтва.
2. Якія асаблівасці мела эпоха Асветніцтва ў розных еўрапейскіх краінах? Чым яны былі абумоўлены?
3. Што такое палітыка асветнага абсалютызму? Якія ідэі Асветніцтва былі рэалізаваны еўрапейскімі манархамі? Ці азначала рэалізацыя палітыкі асветнага абсалютызму прасоўванне да дэмакратычнай прававой дзяржавы?
4. Ахарактарызуйце асаблівасці культуры цывілізацый Усходу ў XVII–XVIII стст. Якім чынам у культуры ўсходніх цывілізацый адбіліся ідэі эпохі Асветніцтва? Ці можна казаць пра ўзаемны ўплыў еўрапейскай культуры і культуры цывілізацый Усходу ў ранні Новы час?
5. Ацаніце гістарычнае значэнне ідэй Асветніцтва для XVII–XVIII стст., для сучаснага грамадства.